# Нашы юбіляры

## НІЛ СЯМЁНАВІЧ ГІЛЕВІЧ
### (Да 50-годдзя з дня нараджэння)



Споўнілася 50 гадоў Нілу Сямёнавічу Гілевічу — вядомаму беларускаму паэту і вучонаму, заслужанаму дзеячу навукі БССР, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы. Жыццёвая і творчая дзейнасць Н. С. Гілевіча вызначаецца мэтанакіраванасцю і падпарадкаванасцю высакароднай ідэі служэння свайму народу і нацыянальнай культуры. Любоў да роднай мовы, жаданне авалодаць багацейшымі скарбамі літаратуры і сказаць у ёй сваё паэтычнае слова прывялі юнака з Лагойшчыны спачатку ў Мінскае педагагічнае вучылішча, а затым на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пасля заканчэння яго (1956) была вучоба ў аспірантуры. Пачынаючы з 1960 года Н. С. Гілевіч працуе на кафедры беларускай літаратуры, дзе прайшоў шлях ад выкладчыка да прафесара.

Кола інтарэсаў Н. С. Гілевіча як даследчыка і крытыка даволі шырокае: Я. Купала і М. Багдановіч, П. Панчанка і С. Дзяргай, В. Вітка і К. Крапіва, творчасць маладых. Крытычныя і публіцыстычныя артыкулы, сабраныя ў кнігу з характэрнай назвай «У гэта веру» (1978), ярка выяўляюць творчую індывідуальнасць аўтара, яго грамадзянскую пазіцыю і эстэтычныя крытэрыі.

З найбольшай сілай талент даследчыка праявіўся ў фалькларыстычнай дзейнасці Н. С. Гілевіча. У яго асобе беларуская навука мае аднаго з буйнейшых тэарэтыкаў і практыкаў савецкай фалькларыстыкі. На працягу 20 гадоў Н. С. Гілевіч чытаў курс беларускага фальклору, кіраваў студэнцкім навуковым гуртком і спецсемінарам па паэтыцы фальклорных жанраў. Ён стаў арганізатарам і навуковым кіраўніком збіральніцкай работы, маштабы і значэнне якой цяжка пераацаніць. Заслужаны аўтарытэт прынеслі Н. С. Гілевічу выданні беларускага фальклору «Песні сямі вёсак» (1973), «Песні народных свят і абрадаў» (1974), «Лірычныя песні» (1976), «Лірыка беларускага вяселля» (1979), укладальнікам і навуковым рэдактарам якіх ён з'яўляецца. Артыкулы Н. С. Гілевіча ў гэтых зборніках — гэта самастойныя навуковыя даследаванні сучаснага стану бытавання традыцыйнай народнай паэзіі. Тэарэтычныя праблемы беларускай фалькларыстыкі распрацаваны ў яго манаграфіях «Наша родная песня» (1968), «З клопатам пра песні народа» (1970), «Паэтыка беларускай народнай лірыкі» (1975), «Паэтыка беларускіх загадак» (1976), а таксама ў дакладзе на VIII Міжнародным з'ездзе славістаў «Вусная народная творчасць і сучасная лірычная паэзія ўсходніх і паўднёвых славян» (1978).

Выкладчыцкую і навуковую дзейнасць Н. С. Гілевіч плённа спалучае з літаратурнай. На яго творчым рахунку звыш 20 паэтычных зборнікаў і зборнік п'ес. Шырока вядомы ён і як перакладчык на беларускую мову з іншых славянскіх моў. Да перакладу і прапаганды лепшых здабыткаў славянскіх культур Ніл Сямёнавіч прыйшоў, клапоцячыся пра пашырэнне далягляду роднай літаратуры. У гэтай галіне дзейнасці ён выступае і як вучоны, аб чым сведчыць яго цікавая манагра-

фія «Верная вялікім запаветам. Сучасная балгарская паэзія. 1956—1976» (1977). За заслугі ў развіцці беларуска-балгарскіх культурных сувязей урад НРБ узнагародзіў Н. С. Гілевіча ордэнам Кірылы і Мефодзія I ступені. За заслугі ў развіцці савецкай літаратуры і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння пісьменнік узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў.

Арыгінальны мастацкі талент, багатая эрудыцыя і шчыры клопат аб развіцці роднай культуры і захаванні яе скарбаў заўсёды збіралі Н. С. Гілевічу аўдыторыю ўдзячных слухачоў. Яго ўплыў на фарміраванне некалькіх пакаленняў беларускіх філолагаў надзвычай вялікі. Сёння тыя якасці, якія выпрацаваліся за час педагагічнай работы ў БДУ, надзейна служаць Н. С. Гілевічу на пасадзе першага сакратара праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

Выкладчыкі і студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта сардэчна віншуюць Ніла Сямёнавіча з юбілеем і жадаюць яму добрага здароўя і новых творчых поспехаў.

**Л. К. Тарасюк**

## СЦЯПАН ХУСЕЙНАВІЧ АЛЕКСАНДРОВІЧ
### (Да 60-годдзя з дня нараджэння)



Сцяпан Хусейнавіч Александровіч—прафесар кафедры беларускай літаратуры і пісьменнік, ветэран Айчыннай вайны і кавалер ордэна Славы—чалавек асаблівага лёсу. Сын гарбара з Капыля, які змалку меў вялікую схільнасць да беларускай кнігі і мовы, у 1939 годзе паступае на філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Але абставіны часу пасвойму распарадзіліся жыццёвым лёсам будучага філолага. Ужо праз месяц ён быў прызваны ў армію. Амаль тры гады нясе нялёгкую салдацкую службу на Паволжы, у Баку. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны удзельнічае ў абароне Крыма. Паранены, трапляе ў палон. Але прага свабоды вядзе яго, разам з сябрамі-украінцамі, да здзяйснення ўцёку з крывարожскага лагера ваеннапалонных. Прага ж помсты ворагу ставіць яго ў рады народных мсціўцаў. Цяпер ужо на радзіме, у складзе капыльскай падпольнай групы...

Далейшы жыццёвы лёс С. Х. Александровіча цалкам звязаны з яго педагагічнай, навуковай і пісьменніцкай дзейнасцю. Чатырнаццаць гадоў аддае ён настаўніцкай працы ў школах Маладзечанскага і Дзятлаўскага раёнаў, у Навагрудскай сярэдняй школе і Мінскім бібліятэчным тэхнікуме. Адначасова—завочная вучоба ў БДУ, затым у аспірантуры АН БССР. Абароненая ў 1958 годзе кандыдацкая дысертацыя «Янка Купала—майстар мастацкага перакладу» становіцца пачаткам яго актыўнай дзейнасці як вучонага-літаратуразнаўцы.

З'яўляючыся навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры АН БССР, Літаратурнага музея Якуба Коласа, а затым, з 1963 года, выкладчыкам кафедры беларускай літаратуры БДУ, С. Х. Александровіч настойліва, карпатліва даследуе шляхі развіцця і фарміравання беларускай дакастрычніцкай літаратуры, яе творчыя ўзаемасувязі з братнімі славянскімі літаратурамі, а таксама гісторыю беларускага кнігадрукавання і журналістыкі. Вынікам яго даследаванняў становяцца змястоўныя, насычаныя багатым фактычным матэрыялам зборнікі артыкулаў і манаграфіі «Старонкі братняй дружбы» (1960), «Гісторыя і сучаснасць» (1968), «Пуцявіны роднага слова» (1971), «Кнігі і людзі» (1976), «Слова—багацце» (1981), вучэбны дапаможнік «Беларуская літаратура XIX—пачатку XX ст. Хрэстаматыя крытычных матэрыялаў» (1978), іншыя навуковыя працы.

У 1971 годзе С. Х. Александровіч абараняе доктарскую дысертацыю «Праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX—пачатку XX ст.». За заслугі ў навукова-педагагічнай дзейнасці яму ў 1974 годзе прысвойваецца званне прафесара кафедры беларускай літаратуры.

Гаворачы пра С. Х. Александровіча як даследчыка і педагога, нельга не адзначыць яго талент пісьменніка-дакументаліста, майстра нарыса. Аб гэтым яскрава сведчаць зборнікі біяграфічных нарысаў пра беларускіх пісьменнікаў «Незабыўнымі сцежкамі» (1959, 1962), «Па слядах паэтычнай легенды» (1965), «Тут зямля такая...» (1974), аповесці аб жыцці і творчасці Якуба Коласа «Ад роднае зямлі...» (1962, 1972) і «Ад гоману бароў...» (1972), аўтабіяграфічная аповесць «Далёкія зарніцы» (1967).

Літаратуразнаўца і пісьменнік, прафесар Сцяпан Хусейнавіч Александровіч сустракае свой шасцідзесяцігадовы юбілей у росквіце сіл, з новымі творчымі планамі і задумамі. І вельмі хочацца, каб яны, гэтыя планы і задумы, спаўна ажыццявіліся.

**І. Ключановіч**